

## ВІНШУЕМ ЛАЎРЭАТАЎ КОНКУРСУ МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ «МАЛАДЗІК»!

Паэзія

1-е месца — Вікторыя ПІЛІПЕНКА

2-е месца — Ірына РАДЗІХОЎСКАЯ

3-е месца — Максім ГАЎРЫС

Проза

1-е месца — Паліна КОРНЕВА

2-е месца — Валерый ПШЫГОДСКІ

3-е месца — Юлія ШУРБІНА-КАРАВАЦКАЯ

Творы пераможцаў надрукаваныя ў альманаху «Маладзік-2026» (выдавецтва «Мастацкая літаратура», 2026)

# ЗМЕСТ

**АЛЯКСАНДРА КАРОЛЬ.** Вужыны хвост. *Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**АРСЕНІЙ ГРОДА.** Вясновы ранак. *Хоку* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
**ВАСІЛЬ ЛАЙКОЎ.** Мой голас. *Вершы* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
**АНДРЭЙ БАЛКОЎСКІ.** Два апавяданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
**АНТАНІНА КАНАПЛЁВА.** На сподачку марской зары.
*Вершы* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
**РЭСПУБЛІКАНСКІ ПАЭТЫЧНЫ КОНКУРС ІМЯ МІКОЛЫ МАЛЯЎКІ СЯРОД МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
**МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ.** Ваўкалакі. *Неагатычны раман. Працяг* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24

**ДА 130-ГОДДЗЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ**
**АЛЕНА АТРАХОВІЧ.** «Праца па складанні радаводу — своеасаблівая рэканструкцыя пакаленняў» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54

**ПЕРАКЛАДЧЫЦКІ ДЭБЮТ**
**ЧЖАН ЮЭЖАНЬ.** *Пераклад з кітайскай Ганны Літош* . . . . . . . . . . . . . 60

**МАСТАЦТВА**
**МІКОЛА РАЎНАПОЛЬСКІ.** Ван Гог са Смаргоншчыны . . . . . . . . . . . . . . . 71

**ПЛЮС-ВАЙБ**
**АРЫНА ПРАНІКАВА.** Тэкставыя ролевыя гульні гадуюць пісьменнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75

**З МАЛАДОСЦЮ Ў СЭРЦЫ**
**ВАСІЛЬ ЗУЁНАК** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
**УЛАДЗІМІР МАЗГО** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83

**СЛО/АВА ЯК НАГОДА**
**СЛАВА ГРЫНЕВІЧ.** «Шэптавая сяйба» Яўгеніі Пракапчук . . . . . . . . . . . 85
Купала разбіў мне сэрца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86

**ЛІТАРАТУРНЫ СВЕТ**
**ЛЯВОН ПАМЫСНЫ.** Заглянуць у глыбіню . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88

**ВАЧЫМА МАЛАДЫХ**
**ПАЛІНА ХІЛЕВІЧ.** У пошуках чыстай вады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93

**У СВЕЦЕ ФАНТАСТЫКІ**
**ТАЦЦЯНА МАРОЗАВА.** Жывая вада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

**СТАРОНКА РОДНАЯ**
**ЯЎГЕН ПАПАКУЛЬ.** Нарысы-ўспаміны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108



# АЛЯКСАНДРА КАРОЛЬ

## Вужыны хвост

Апавяданне

***Кароль Аляксандра нарадзілася 9 ліпеня 1993 года ў Мінску. Пасля заканчэння гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна працавала выкладчыкам гісторыі і грамадазнаўства ў Брэсцкім дзяржаўным прафесійным ліцэі чыгуначнага транспарту, галоўным рэдактарам інтэрнэт-партала MediaBrest.by, бібліятэкарам Брэсцкай пагранічнай групы. Зараз працуе ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна (г. Брэст). Мае ступень магістра гістарычных навук. Друкавалася ў часопісе «Маладосць», альманаху «Першацвет», зборніках прозы «Цень зоркі», «Слишком много кошмаров», «Кошачьим шагом», «Городские сказки. Ночь», «Вазьмі сваю свяцільню».***

Востраў у цэнтры возера называлі Вужыным хвастом, як за тое, што ў ім вадзілася багата вужоў, так і за змеепадобную форму. Глядзець там было няма на што — вузкая палоска зямлі, парослая быллём, але дзіцячае ўяўленне, якому ўласціва бачыць звышнатуральнае ў самых звычайных рэчах, не магло не ахутаць гэты нікчэмны кавалачак светапабудовы містычнай таямніцай.

Абрад прысвячэння прыдумаў Лёша, які знайшоў нешта такое ў кнігах пра старажытныя звычаі. Мацвей, сын бацюшкі і таму лепш за ўсіх знаёмы з тэкстам Бібліі, штосьці прапішчаў пра Эдэмскі сад і дрэва пазнання. Лёшу аповед пра тое, што Адама і Еву выгналі з раю з-за нейкага яблыка, не адпудзіў, хутчэй наадварот — распаліў. Ну а Руслан проста быў самы здаровы і моцны з усёй кампаніі, і таму ідэю — даказаць сваю дарослаць і мужнасць, даплыўшы да выспы і сарваўшы яблык з яблыні, што расла там, дзе ў «вужа» красавалася жоўтая пляма — давялося ўвасабляць менавіта яму.

— Гэта называецца і-н-і-ц-ы-я-ц-ы-я,— вочы Лёшы ўзбуджана блішчалі пад тоўстымі шкельцамі акуляраў.— Калі сустрэнеш русалак ці як іх там… вужалак, не слухай і не глядзі ім у вочы.

Руслан у містычную лухту, што востраў — на самай справе велізарны вуж, які заснуў у возеры шмат стагоддзяў таму, не верыў. І, канешне, не верыў у тое, што, сарваўшы яблык на Вужыным востраве, можна абудзіць старажытную істоту. Яблык ён і ёсць яблык, і чаго гэты Бог, пра якога ўсё паўтарае Мацвей, так раззлаваўся? Хаця вось цётка Тома таксама злуецца, калі ён залазіць у яе сад. Таму што злая і прагная, а Бог быццам бы добры... Ці не?

Вада ў возеры, нягледзячы на цёплы жнівеньскі дзень, была халоднай. Руслан плаваць любіў і сцюдзёнкі не баяўся, а таму пару хвілін дазволіў сабе проста пабоўтацца. Лёша і Мацвей сачылі за яго поспехамі з берага. Махнуўшы ім, Руслан накіраваўся ў бок вострава.

Вужыны хвост увесь зарос хмызняком, вострыя калючкі ўпіваліся ў пяткі, галінкі драпалі плечы. Вылаяўшыся на Лёшу і яго вар'яцкія ідэі, Руслан стаў прабірацца да



# АРСЕНІЙ ГРОДА

## Вясновы ранак

Хоку

*Грода Арсеній нарадзіўся 27 лістапада 2007 года ў Мінску. Студэнт філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вершы друкаваліся ў часопісе «Бярозка» і штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».*

* * *

Кубак рамонка.
Свежы вясновы вецер.
Так цёпла ўнутры!

* * *

Белыя дрэвы
Парассыпалі квецень
Па зямлі й вадзе.

* * *

Крычыць варона
У красавіцкім небе.
Першы бляск сонца!

* * *

Якая свежасць!
Сонна паўзе тоўсты хрушч
Па ствале ліпы.

* * *

Вясновы ранак:
Прывабна зелянее
Лісце каштанаў.

* * *

Цёплы красавік,
Сонечны сасновы бор.
Так пахне хвояй!

* * *

Першыя зоркі
Над зялёным захадам,
Як вішні, цвітуць!..

* * *

Так зелянеюць
Аблокі над захадам!
Вечар у Вільні.

* * *

Вясновы вечар.
Размова ў аўтобусе —
Як сонна й цёпла!

Фота з архіва А. Гроды



# ВАСІЛЬ ЛАЙКОЎ

## Мой голас

Вершы

***Лайкоў Васіль нарадзіўся 18 мая 2004 года ў Барысаве. Па адукацыі дызайнер. Аўтар выставы графічных малюнкаў гарадскога пейзажу «Стары горад». Захапляецца музыкай і тэатрам, піша песні. Пераможца тэатральных конкурсаў Мінскай вобласці. Супрацоўнічае з выдавецтвам «Чатыры чвэрці» ў якасці дызайнера. Жыве ў Барысаве.***

### Котка

*Згодна з легендай, дух Максіма Багдановіча ўвасабляецца ў котку і паказвае паломнікам з Беларусі шлях да магілы класіка ў Ялце.*

Мае родныя госці,
Каб вы ведалі, як жа
На чужынскім пагосце
Пахаваным быць цяжка!

Не свае сцежкі ўюцца
Між задумлівых кветак,
Ды аблокі ліюцца
На рабінавы ветах.

Па начах тут блукаю
Беспрытульнаю коткай.
Вас я, госці, чакаю
У самоце маркотнай.

Ды як хтось завітае
Да мяне з Беларусі,
Я адразу пазнаю,
Да яго прытулюся.

Ў мар салодкім палоне
Замурчу, заспяваю
І ўдыхну ад далоні
Паху роднага краю.

### Карціна

Крочу па знаёмых мясцінах —
шырокіх
сцежках музейнай карціны.
А недзе
там, за падрамнікам драхлым,
ёсць пекла,
дзе Д'ябал жахлівы
падсмажвае страву,
згатаваную Богам…

У паветры паперка…
На паперцы дзве плямы —
надта для кропак,
але ж невялікія.

# РЭСПУБЛІКАНСКІ ПАЭТЫЧНЫ КОНКУРС ІМЯ МІКОЛЫ МАЛЯЎКІ СЯРОД МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ

*Вось і падведзеныя вынікі II Рэспубліканскага паэтычнага конкурсу імя Міколы Маляўкі сярод маладых паэтаў. Удзел бралі як пачаткоўцы, так і аўтары, за плячыма якіх публікацыі ў літаратурных часопісах. Увазе чытачоў прапануюцца выбраныя творы канкурсантаў. У якасці падарунка ад арганізатара — Саюза пісьменнікаў Беларусі — пераможцы атрымалі квартальную падпіску на часопіс «Маладосць», а дыпламанты — зборнікі вершаў Міколы Маляўкі.*


## ЯЎГЕНІЯ ПРАКАПЧУК

*г. Ганцавічы*


### Сумненні

Я спрабую ўзысці,
але мне не даюць адштурхнуцца
ні маё цемрашальства,
ні вобразаў збітая гаць,
але я паспрабую
сказаць штосьці моваю куцай,
я яшчэ паспрабую
да макавак хвойных дастаць.
І пакуль мае рыфмы
падміргваюць словам куртатым,
покуль вены мае
надзьмуваюцца рытмам радкоў,
я ў дарозе і я —
так далёка ад роднае хаты,
так пранізліва блізка
да мне недаступных замкоў.

### Не я

Калі памірала зямля мая
ад смерці сухой, бяскроўнае,
галоўным героем была не я.
Не я была там галоўнаю.

Калі срэбнай споведдзю з ручая
малітва ў сусвет спрамоўвала,
галоўным героем была не я
і песні не я захоўвала.

Не я падымала пясок са дна,
не я крыжавала нітачкі,
і, каб намаліць добры шлях, сынам
сушыла не я скарыначкі.

І ў час, як бяду стане жаць жняя
у зорную ноч палынную,
галоўным героем прыйду не я,
ды буду там — гераіняю.



# МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ

## Ваўкалакі

Неагатычны раман

Працяг. Друкуецца з №1 за 2025 год

*Латышкевіч Маргарыта нарадзілася 19 студзеня 1989 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, працягвала навучанне ў магістратуры і аспірантуры. Працуе ў галіне наратыву камп'ютарных гульняў, жыве ў Полацку. Піша вершы і прозу. Актыўна развіваецца ў жанры міфалагічнага фэнтэзі.*

*Аўтар кніг вершаў «Пульс навальніц», «Там, дзе сэрца», кніг прозы «Яблыкі», «Наш дом», «Уласны крыж», «Лисиный перстенек», «Муры, Том і дырыжаблік», «Вершнікі на дарозе». Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.*

34

Жаброўскі ўжо мусіць быць у Вільні са сваёй справаздачай — прынамсі, так патлумачыў пан Адам, калі яны разам з Соф'яй пакінулі абедзенную залю, поўную прыглушаных шэптаў. Аднак яшчэ да ад'езду абачлівы віцэ-губернатар паспеў аддаць колькі загадаў, найперш наконт таго, каб звесткі пра з'яўленне пачвары або падазроных людзей тэрмінова прывозілі ў Свольну.

І вось звесткі прыйшлі.

— Значыць, вашая ваўчыная пастка спрацавала? — вымавіла Соф'я, у якой ад нядобрага прадчування сціскалася сэрца. Рынтовіч крывенька ўсміхнуўся.

— Верагодна,— пацвердзіў ён, але неяк суха і бязрадасна, быццам яго самога не ўсцешылі гэтыя сведчанні поспеху сваёй задумы.— А таму вам трэба быць гатовай.

— Да з'яўлення жняца? — спытала Соф'я глуха, і дрыготка прабегла па яе плячах. Рынтовіч кіўнуў і, дастаўшы з кішэні складзены аркуш ды мініяцюрны папяровы скрутак, на хаду працягнуў усё панне. На аркушы месцілася знаёмая пентаграма, а ў скрутку, не большым за Соф'ін мезенны палец, аказалася крэйда.

— Ultima ratio[1],— патлумачыў пан Адам, панізіўшы голас, бо яны патроху набліжаліся да лесвіцы ўніз, у фае, адкуль даносіліся галасы жандараў.— Гэта, хай і часова, зможа схаваць вас ад каго заўгодна, таму што…

— Я памятаю,— рассеяна мовіла Соф'я, узважваючы кавалак загаворанай крэйды на далоні.— Гэта — старадаўні абарончы сімвал. Вы малявалі яго тады, у каралеўскім замку. Калі мы мінулы раз… калі я…

Яна асеклася, чакаючы, што і пан Адам прыгадае тую сустрэчу, што неяк адгукнецца на ейныя ўспаміны. Але ён прамаўчаў, і чуваць было толькі іхнія крокі па каменнай плітцы калідора — крокі, памножаныя рэхам, быццам бясконцыя копіі, незлічоныя верагоднасці, блытаючыся, адначасна ішлі следам. Аднак сапраўдная Соф'я спынілася,

[1] Крайняя мера *(лац.)*.



# АЛЕНА АТРАХОВІЧ:

## «Праца па складанні радаводу — своеасаблівая рэканструкцыя пакаленняў»

*Да 130-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка БССР Кандрата Крапівы мы пагаварылі з яго ўнучкай — Аленай Атраховіч — кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам. Абмеркавалі яе захапленні і планы на будучыню. А таксама пагутарылі пра асабістую рэч дзядулі, якую яна пакуль не гатовая перадаць у архіў.*

**— Алена Ігараўна, вы шмат гадоў працуеце выкладчыкам — у розных універсітэтах, на розных пасадах, але заўсёды са студэнтамі. Ці лёгка працаваць з моладдзю?**

— Пытанне складанае і шматграннае. Адназначна адказаць не бяруся. Сучасны падыход да выкладання заключаецца не толькі ў трансляцыі ведаў. Асабліва калі працуеш з творчай моладдзю, бо трэба надаваць шмат увагі развіццю творчай асобы. Гэта патрабуе ўмення пераключацца ў інтэрактыўны фармат, а значыць, самому неабходна быць крэатыўнай асобай.

Сёння студэнты вельмі загружаныя інфармацыяй, медыйным кантэнтам. А нам, выкладчыкам, паколькі мы працуем з будучымі дызайнерамі, варта сфарміраваць у іх уменне гэтую інфармацыю фільтраваць, каб яны маглі адысці ад прывычных уяўленняў, знайсці арыгінальную ідэю. Мне вельмі цікава з творчай моладдзю, бо нашы студэнты вылучаюцца адкрытасцю да інавацый.

**— Цяпер вы загадчыца кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ. Раскажыце, каго рыхтуюць на кафедры. Ці шмат хлопцаў паступае на дызайнера касцюма альбо яна прыярытэтная ў дзяўчат?**

— Мы ажыццяўляем навучанне па спецыяльнасці «дызайн касцюма і тэкстылю». Нашы студэнты — будучыя дызайнеры

адзення і тэкстылю шырокага профілю, здольныя да праектнай, мастацка-тэхнічнай і нават даследчай дзейнасці, бо кожны год хтосьці з выпускнікоў паступае ў магістратуру.

Падчас вучобы яны набываюць комплексныя прафесійныя веды ў галіне гісторыі касцюма і моды, гісторыі дызайну, малюнка, жывапісу, кампазіцыі, а таксама асвойваюць спецыяльныя дысцыпліны: мастацкае праектаванне і канструяванне, тэхналогію швейных вырабаў, матэрыялазнаўства. Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню сучасных інфармацыйных тэхналогій, што неабходна для лічбавага праектавання і віртуальнай прэзентацыі калекцый мадэлей моднага адзення.

Хлопцаў у нас не шмат, галоўным чынам дзяўчаты. Гэта натуральна, бо спецыфіка жаночая. Але і хлопцы прыходзяць і, дарэчы, вельмі паспяхова вучацца. Спецыялізуюцца ў асноўным на праектаванні мужчынскага адзення.

**— Ваша жыццё з ранняга ўзросту звязана з малюнкам. Вы прафесійны мастак і фатограф. Якім накірункам захапляецеся цяпер? Ці малявалі калі-небудзь партрэты сваіх родных?**

— Так, колькі сябе памятаю, увесь час малявала. Многае ў нашым жыцці пачынаецца з дзяцінства. Мой бацька, Ігар Кандратавіч, быў архітэктарам. Палову жыцця працаваў у праектным інстытуце і ўдзельнічаў у праектаванні мікрараёнаў Мінска. Ён скончыў Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна (зараз — Санкт-Пецярбургская акадэмія мастацтваў імя І. Я. Рэпіна) і вельмі добра маляваў. Таму ў доме заўсёды меліся мастацкія прылады — алоўкі, вугаль, сангіна, іншыя графічныя матэрыялы. Дарэчы, менавіта тата быў маім першым настаўнікам па малюнку. А прывяло маё дзіцячае захапленне да прафесійнай дызайнерскай адукацыі.

Ёсць у мяне партрэт майго дзеда, які аднойчы намалявала з натуры. Зараз гэта практычна музейная каштоўнасць, бо партрэт прыжыццёвы.

З дзяцінства пачалося і маё захапленне фатаграфіяй. Калі была яшчэ маленькай



Кандрат Крапіва

дзяўчынкай, тата падараваў мне мініяцюрны фотаапарат «Вега». Цяпер я яго захоўваю як талісман. З таго часу «захварэла» фатаграфіяй. Захапляюся і зараз. Вакол нас столькі прыгажосці, трэба толькі ўважліва ўглядацца. Вось фатаграфія і дапамагае гэтыя прыгожыя імгненні захаваць. Думаю зрабіць выставу, ёсць ужо прапановы.

**— Вы ў адным са сваіх інтэрв'ю расказвалі, што займаецеся складаннем радаводу сям'і Атраховічаў. На якім этапе праца цяпер?**

— Праца па складанні радаводу — працэс доўгі, руплівы. Гэта своеасаблівая рэканструкцыя пакаленняў. Неабходна вызначыць прамую лінію ад найбольш ранняга вядомага продка да яго нашчадкаў. Тую сувязь трэба падцвердзіць дакументальна.

Зараз давялося высветліць радавод па лініі Атраховічаў ад пачатку XIX стагоддзя. Згодна дакументам сярэдзіны XIX стагоддзя, у той час у Нізку існавала толькі адна сядзіба з такім прозвішчам. Гаспадаром яе быў прыгонны селянін Антось Атраховіч

# СЛО/АВА ЯК НАГОДА



Слава Грыневіч

## «Шэптавая сяйба» Яўгеніі Пракапчук

Люблю гартаць гадавыя падборкі часопісаў. Выбіраеш на свой густ хоць сакавіты жнівень, хоць пяшчотны красавік і пад кубак кавы перагортваеш старонкі, прыгадваеш першыя ўражанні ад сустрэчы з аўтарамі.

Гэтай раніцай у маіх руках — чэрвень 2025-га. І я вяртаюся да паэтычнай нізкі, якая яшчэ тады кінулася ў вочы:

> Узбуяла да вострых нябёс трава —
> льецца шэптавая сяйба.



Яўгенія Пракапчук

Ёсць вершы, якія не трэба чытаць уголас — хутчэй шаптаць, прагаворваць для сябе па некалькі разоў, быццам хайку. Нізка Яўгеніі Пракапчук у летнім нумары «Маладосці» — менавіта з такіх.

Можна сказаць, традыцыйная лірыка, нескладаная ў рытміцы. Халаднаватая нават, без яркага пачуцця, яўнага аўтарскага «я». Амаль фалькларная, песенная на ўзроўні вобразаў: зямля, вецер, неба, снег, пахілыя вербы.

Але калі прыгледзецца — гэта не архетыпы «з падручніка», а ўласнае, вострае пражыванне свету, дзе ўсё адбываецца на мяжы: паміж зямлёй і нябёсамі, болем і пяшчотай, жыццём… і тым, што за ім.

Тут зямля — і суразмоўца, і альтэр эга. Невыпадкова ў вершы «Багновае» Пракапчук гаворыць пра зямлю так:

> ...яна мой лёс, мой шлях, мая цяснота,
> я частка яе вострага галля.

У гэтым зрастанні, атаясамленні ёсць нешта спрадвечнае, нават крыху язычніцкае: калі чалавек дае свой голас стыхіі. У вершы «Насенне. Галлё. Ралля…» зямля спявае — і нібы для чалавека, і замест яго. Сцверджанне «Я чую твой спеў, зямля» становіцца актам уважлівага слухання, глыбокага паяднання з прыродай, усведамлення сябе яе натуральнай часткай. Аўтарскае «я» растворана ў наваколлі, зямля становіцца нібы ўласным целам, у венах якога б'ецца жывая чалавечая кроў:

> І калі не расчуліцца неба,
> То зямлі толькі й венамі жыць.

Тут няма тэатра і пазёрства, толькі настроенасць на ўнутраную цішыню «ваяра адзінокага», паэта, безабароннага ў сваёй вострай еднасці з адвечным.

# ВАЧЫМА МАЛАДЫХ

## ПАЛІНА ХІЛЕВІЧ

### У пошуках чыстай вады

Кніга Алеся Карлюкевіча «Шубуршун шукае чыстую ваду» — гэта не проста чарговая дзіцячая казка, а спроба праз прыгоды маленькага героя закрануць вялікія тэмы, якія датычацца кожнага чалавека. У аснове аповеда — пошук чыстай вады, але за гэтым стаіць значна больш: пошук чысціні ў жыцці, у думках, у адносінах да прыроды і да людзей. Аўтар праз казачныя вобразы паказвае, што экалогія — гэта не абстрактная навука, а штодзённая адказнасць кожнага.

Шубуршун — герой, які ўвасабляе дзіцячую цікаўнасць і адкрытасць да свету. Ён не проста шукае ваду, ён шукае праўду, шукае тое, што сапраўды важна. І ў гэтым пошуку яму сустракаюцца розныя персанажы, кожны з якіх дадае ў гісторыю свае адценні.

Чароўная Пясчынка, напрыклад, сцвярджае, што ў Беларусі няма забруджаных рэк, а вось у іншых краінах — хапае: *«Ды іх [забруджаных рэк] і няма ў тваёй роднай і светлай старонцы! А вось у іншых краінах хапае брудных. Яны ёсць у Амерыцы і Азіі, на Філіпінах, у Італіі, Інданезіі і Індыі…»* Гэты момант выклікае супярэчлівыя эмоцыі. З аднаго боку, ён падкрэслівае любоў да роднай зямлі, імкненне паказаць яе як чысты і светлы край. З другога — у ім ёсць ідэалізацыя, якая можа ўводзіць у зман. Бо экалагічныя праблемы існуюць паўсюль, і ў Беларусі таксама. Таму гэтая сцэна становіцца добрай нагодай для дыскусіі, бо дарослыя могуць растлумачыць дзецям, што сапраўдная любоў да радзімы праяўляецца не ў тым, каб закрываць вочы на праблемы, а ў тым, каб бачыць іх і шукаць шляхі вырашэння. Такім чынам, нават спрэчны момант працуе на карысць кнігі, бо падштурхоўвае да разважанняў.

На сваім шляху Шубуршун сустракае розных істот і людзей, і кожная сустрэча — гэта нібы маленькі вузельчык у яго дарозе. Яны не проста ўпрыгожваюць казку, а пакідаюць у душы героя след: то параду, то сумнеў, то




Алесь Карлюкевіч. Шубуршун шукае чыстую ваду : аповесць-казка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2025. — 71 с.